*Наталля Петухова*

# ФАЛЬКЛАРЫЗМ У ДЗЕЙНАСЦІ АМАТАРСКАГА КАЛЕКТЫВУ

*Статья посвящена проблеме возрождения народных традиций в деятельности любительских фольклорных коллективов, что представляет собой разновидность фольклоризма. Под фольклоризмом автор понимает любое использование аутентичного фольклора вне естественной для него среды, в том числе на сцене.*

*This article is devoted to the problem of the revival of folk traditions in the activities of amateur folklore groups, which is a kind of folklorism. By folklorism, the author understands any authentic folklore use outside it's natural environment, including perfomances.*

У сучасных сацыяльна-культурных умовах на тэрыторыі Беларусі яшчэ шмат дзе захаваліся крыніцы сапраўднага аўтэнтычнага фальклору і ўзоры яго натуральнай (спантаннай) трансляцыі, аднак рост гарадоў і актыўнае далучэнне нашай краіны да сусветнай інфармацыйнай прасторы пагражае існаванню народнай культуры. Гэта акалічнасць актуалізуе патрэбу ў трансляцыі папулярызацыі сярод дзяцей і моладзі ўзораў фальклорнай спадчыны, з якой кроўна звязаны пачуцці любові да бацькаўшчыны, нацыянальнай годнасці, шанавання сваіх вытокаў, каранёў.

Значнае месца ў распаўсюджванні каштоўнасцей народнай культуры надаецца аматарскім фальклорным калектывам (А. М. Аляхновіч, І. М. Грамовіч, Л. Л. Ражкова, В. В. Калацэй, М. А. Козенка, Т. А. Пладунова іншыя). Аднак спецыфіка іх дзейнасці значна адрозніваецца ад традыцыйнай практыкі засваення і выканання фальклорных твораў, фарміравання ад рэпертуару этна-аўтэнтычных

калектываў, дзе творчая дзейнасць арганічна спалучаецца з бытам і адпачынкам, каляндарнымі і сямейнымі святамі. Кірунак мастацкай творчасці аматарскага фальклорнага калектыву ўяўляе сабой аднаўленне традыцыйнай спадчыны ў другасных, пераважна сцэнічных, умовах, таму іх дзейнасць, як засведчыў Б. М. Пуцілаў, «у адрозненне ад дзейнасці традыцыйнага фальклорнага гурту працякае не ў межах фальклору, а фалькларызму» [1, *43*]. Гэта дае падставы гаварыць аб з'яўленні новага неаўтэнтычнага асяроддзя бытавання традыцыйнай спадчыны.

Фалькларызм – яркая з'ява сучаснай мастацкай культуры, якая адлюстроўвае ўвесь спектр творчых інтэрпрэтацый фальклору. Тэрмін «фальклрызм» быў уведзены ў навуковы зварот французскім даследчыкам П. Себіё для характарыстыкі другасных, не аўтэнтычных фальклорных з'яў (фальклор на сцэне, у аматарскай і прафесійнай творчасці і інш.). Шырокае распаўсюджванне ён атрымаў у 60-х гг. XX ст., што тлумачыцца навуковым асэнсаваннем масавай міграцыі вясковага насельніцтва з уласцівай яму фальклорнай культурай у гарадское асяроддзе. Аднак навуковае вызначэнне тэрміна «фальклрызм» не канчаткова выверанае і ўключае ў сябе шэраг супярэчнасцей. Гэта абумоўлена тым, што ён ахоплівае складаныя працэсы выкарыстання, адаптацыі і трансфармацыі традыцыйнага фальклору ў розных сферах сучаснай культуры. Асобныя навукоўцы (П. Р. Багатыроў, К. А. Багданаў, А. У. Захараў, Р. В. Якабсон іінішыя) пад фальклрызмам разумеюць перш за ўсё яго негатыўныя праявы: псеўданародную стылізацыю, празмерную мадэрнізацыю, якія вядуць да нівеліравання нацыянальных вытокаў, камерцыялізацыі фальклору і г. д. Разам з тым існуе прынцыпова іншы падыход (В. Я. Гусеў, Э. К. Дарашэвіч, І. І. Зямцоўскі, Б. М. Пуцілаў іінішыя), накіраваны на разуменне і ацэнку

глыбіннай сутнасці фальклору, на захаванне яго каштоўнасцей у сучаснай сацыяльна-культурнай рэчаіснасці. Пры гэтым аксіялагічнай мерай выступае першасная, аўтэнтычная, сутнасць фальклору.

Менавіта апошні падыход дае магчымасць вызначыць і асэнсаваць ступень ператварэння і трансфармацыі аўтэнтычнага фальклору ў творчай дзейнасці аматарскіх калектываў, што патрабуе прынцыповай ацэнкі формаў засваення і выканальніцкай інтэрпрэтацыі фальклорных узораў.

І. М. Грамовіч, А. С. Кабанаў, Н. В. Калугіна, А. Ю. Любамудрава, Л. Л. Ражкова і іншыя даследчыкі згодна вылучаюць чатыры тыпы выканальніцкай інтэрпрэтацыі, якія характаразуюць узроўні і сутнасць спасціжэння фальклорных твораў і, адпаведна, вызначаюць розныя формы арганізацыі фальклорных калектываў: 1) першасны традыцыйны спеў *этнааўтэнтычных фальклорных груп* пры ўзнаўленні фальклорных узораў захоўвае стылявыя рысы і побытавую практыку іх функцыянавання праз удзел у святах і абрадах роднай мясцовасці; 2) дзейнасць*этнаграфічных фальклорных калектываў* адлюстроўвае рэпрадуктыўны спеў з захаваннем мясцовых (лакальных, рэгіянальных) асаблівасцей: яны рэпрэзентуюць традыцыйную спадчыну ў другасных, пераважна сцэнічных, умовах; 3) выбарачнае стаўленне да традыцыйнага спеву, сінтэз фальклорнага і акадэмічнага пачатку ўласцівы творчай дзейнасці *народна-акадэмічных калектываў*; 4) для дзейнасці*фальклорна-сцэнічных калектываў* характэрна стылізацыя народна-песенных традыцый з арыентацыяй на ўніфікаваны ўзор, пры якім не захоўваецца мясцовая выканальніцкая спецыфіка.

У сучаснай сацыякультурнай сітуацыі адзначаныя формы арганізацыі фальклорных калектываў і прадстаўленыя імі тыпы выканальніцкай інтэрпрэтацыі фальклорных узораў рэдка існуюць у

чыстым выглядзе. Яны спалучаюцца, канкурыруюць і часта дапаўняюць адзін аднаго, утвараючы даволі складаную, шматколерную палітру сучаснай культуры, адлюстроўваючы адначасова і яе багацце, і пашырэнне межаў, і страту першапачатковай цэласнасці народнай культуры ў залежнасці ад выбраных крытэрыяў ацэнкі.

Сучасная сацыякультурная рэчаіснасць, якая паўплывала на ўзнікненне фальклярызму, паставіла перад аматарскімі калектывамі адразу некалькі істотных пытанняў, вырашэнне якіх вызначае мастацкую стылістыку іх дзейнасці.

Першае з іх – адкуль браць фальклорны рэпертуар і як з ім працаваць. Для гэтага на рэпетыцыях кіраўнікі калектываў найчасцей выкарыстоўваюць аўдыё- і відэазапісы этнаграфічнай музыкі. Аднак значнае месца дагэтуль займаюць і нотныя прыклады фальклору, што, на наш погляд, не дазваляе ў поўнай меры адлюстраваць жывы фальклорны гук і народнае слова. Добрай школай народных выканальніцкіх традыцый з'яўляюцца шматлікія музычна-харэаграфічныя фальклорныя канцэрты, фестывалі і конкурсы, сярод якіх вылучаюцца Міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (Гомель), «Палескі карагод» (Пінск), «Беларуская полька» (Чачэрск), Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» (г. п. Акцябрскі), абласны фестываль традыцыйнага танца «Мінская кадрыля» (Барысаў), абласны фестываль рэгіянальнага фальклору «Панямоння жыватворныя крыніцы» (г. п. Дзятлаў), Рэспубліканскі этнаграфічны канцэрт «Фальклор беларускай глыбінкі» (Мінск) і іншыя. На гэтых мерапрыемствах, як правіла, прадстаўлены цікавыя прыклады традыцыйнай культуры. Тут раскрываецца сапраўды народнае майстэрства ў спевах, гульнях, танцах, карагодах.

У народнай традыцыі рэдка бывае, каб выканаўцы спявалі стоячы, нерухома. Наадварот, яны актыўныя ствaральнікі дзеяння самой песні, якая заўсёды аповед аб якімсьці баку жыцця, што глыбока і шчыра перажываецца спевакамі. Багацце жыццёвых уражанняў, паўната адчуванняў – усё гэта робіць песню народных майстроў яркай і праўдзівай, людзі спяваюць і скачуць ад душы. Пра гэта сведчыць іх аблічча, выразны жэст, міміка, павароты корпуса, тыя ці іншыя натуральныя і непасрэдныя рухі рук, ног, галавы, якія дапамагаюць аўтэнтычным выканаўцам раскрыць эмацыйны характар і рытмічны пульс фальклорнага твора. Так адбываецца і, калі яны спяваюць як бы толькі для сябе, і калі распавядаюць яе сваім сяброўкам і сябрам. Усё гэта патрабуе дадатковых выканальніцкіх прыёмаў, пераходаў, перастраенняў, асаблівых танцавальных крокаў.

Другая праблема, якая ўзнікла ў сувязі з функцыянаваннем «дрогасных» калектываў, заключаецца ў тым, што фальклорных традыцый і манер выканання традыцыйнай музыкі мноства. Тут варта выбраць для дзейнасці калектыву пэўны кірунак – альбо выконваць ўзоры, якія належаць да розных традыцый, альбо прытрымлівацца адной з іх, найбольш блізкай па музычным параметрах. Яшчэ адзін фактар – грамадскае стаўленне да традыцый выкарыстання фальклору ў гарадскім культурным асяроддзі. Шэраг ансамбляў імкнуцца прадставіць слухачам разнастайную праграму, каб выклікаць у публікі больш глыбокі інтарэс да сваёй творчасці. Другія разлічваюць захаваць сапраўды рэдкія і каштоўныя ўзоры народнай музыкі ў рэальным гучанні.

Трэцяя праблема – гэта дамінаванне ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыімастацкай функцыі фальклору. Але фальклор, як вядома,тая з’ява, якая выходзіць за межы паняцця «народнае мастацтва» і разглядаецца як

спосаб быцця традыцыйнага грамадства, як працэс, звязаны з працоўнай дзейнасцю, побытам і звычаямі народа. Аб побытавай практыцы паходжання фальклору сведчаць спецыфічныя рысы, якія адрозніваюць яго ад іншых відаў мастацтва (літаратуры, тэатра, жывапісу, музыкііінш.): калектыўны пачатак, гуртавая прырода стварэння, абумоўленасць традыцыяй (народныя ўяўленні аб грамадскім жыцці, прыродзе і характэрныя спосабы іх мастацкага ўвасаблення, вуснасць (спецыфіка стварэння, бытавання, арганізацыі трансляцыі), сітуацыйнасць (сувязь фальклорных твораў з жыццём, кантэкстам выканання), варыятыўнасць (форма функцыянавання народнага мастацтва, яго імправізацыйнае пераўтварэнне пры захаванні арыентацыі на традыцыйны ўзор), сінкрэтызм (непарыўнае адзінства розных відаў народнага мастацтва).

Падкрэслім, што фальклор – гэта культурны феномен, якому ўласцівы сінтэз мастацкіх элементаў і немастацкіх структур, дзе побач з узорамі, якія функцыянуюць у сістэме мастацтва, існуе мноства форм бытавога, рэлігійнага іiншага характару. Шматлікія фальклорныя творы бытавалі толькі пры пэўных акалічнасцях: суправаджалі працоўную дзейнасць чалавека, важнейшыя падзеіяго жыцця (нараджэнне, шлюб, смерць), дапамагалі ў выхаванні дзяцей, транслюючы новым пакаленням жыццёвую мудрасць, веды і вопыт. Менавіта таму ў традыцыйным фальклоры амаль адсутнічаюць мастацкія творы, не звязаныя так ці інакш з пэўнай жыццёвай сітуацыяй.

Такім чынам, этнаграфічныя сувязі фальклору ўнівесальныя. Ён існаваў у побыце канкрэтнага соцыуму, выконваючы ў ім мноства функцый, з якіх мастацкая – таксама значная. Семантыка арнаменту, манера і спосаб гукавядзення, руху ў танцы – усё першапачаткова мела строгае абгрунтаванне, дзе прыгажосць і эстэтыка існавалі не самі па сабе.

а як складовая частка цэлага. Вылучаючы толькі «мастацкую» частку традыцыі – песню, танец, вышыўку, мы пераносім яе на іншую глебу. Відавочна, што пры гэтым маем справу ўжо не з арыгіналам, а з копіяй. Працэс гэты, безумоўна, заканамерны, і змагацца з ім бессэнсоўна. Але пры такім развіцці падзей фальклор губляе сваё спецыфічнае месца ў культуры і пачынае выконваць тыя ж функцыі, якія выконвае музыка ў развітым урбаністычным грамадстве. Народныя песні, танцы, інструментальная музыка функцыянуюць як рэпертуар і адрозніваюцца ад рэпертуару іншых калектываў толькі тым, што гэта проста «іншая музыка».

Чацвёртая праблема – непадрыхтаванасць слухача. Паколькі фальклор пабудаваны на мове лакальна абмежаваных этнасацыяльны груп, то для таго, каб адбылася фальклорная камунікацыя паміж выканаўцам і слухачом, трэба валодаць гэтай мовай або як мінімум разумець яе. Але такога разумення ў поўнай меры не адбываецца. Напрыклад, спевы на дыялектах беларускай мовы ўспрымаецца гарадскім, пераважна рускамоўным, слухачомпрактычна як спевы на замежнай мове. Тым самым губляецца змест твораў. Іншымі словамі, адраджэння фальклору не адбываецца – здымаецца эстэтычны пласт фальклорнай культуры, пэўным чынам кансервуецца і выстаўляецца для ўсеагульнага ўспрымання.

У дадзеным артыкуле мы ахарактарызаваліформы арганізацыі фальклорных калектываў у межах фалькларызму, акрэслім прадстаўленыя імі тыпы выканальніцкай інтэрпрэтацыі традыцыйных узораў, закранулі пытанні, вырашэнне якіх важна для вызначэння мастацкай стылістыкіфальклорных калектываў, гарманічнага фарміравання рэпертуару, пошукаў уласнай або захаванне аўтэнтычнай манеры

выканання, а таксама для падрыхтоўкі слухачоў да паўнацэннага ўспрымання лакальна абмежаванага традыцыйнага фальклору.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Путилов. Б. Н.* Фольклор и художественная самодеятельность / Б. Н. Путилов. – Ленинград : Наука, 1968. – 135 с.



***Ірына Піваварчык***


# МІФАЛАГЕМА «ЖЫВАЯ ВАДА» Ў РЭКЛАМНЫМ ТЭКСЦЕ ГАЗЕТЫ «НАША НІВА»


*Исследование посвящено изучению мифа и мифологемы'живой воды'в создании рекламного образа медицинского препарата. Автор приходит к выводу, что для рекламирования объекта в текстах широко используются мифологические принципы, мифологическая аргументация и мифологический язык.*

*The article is devoted to the study of the myth and the archetype of 'living water' in creating an advertising image of a medical drug. The author comes to the conclusion that mythological principles, mythological arguments and mythological language are widely used to advertise the object in the texts.*


Газета «Наша Ніва» – самае ўплывовае выданне дарэвалюцыйнай Беларусі, у якім друкаваліся ўнікальныя звесткі з жыцця рэгіёнаў. Газета аб'ядноўвала грамадскіх дзеячаў і мясцовых даследчыкаў-любіцеляў, што ўплывала на яе папулярнасць, глыбіню і рознабаковасць надрукаванага матэрыялу.

У беларускай навуцы маецца нямала прац, прысвечаных даследаванню функцыянавання газеты «Наша Ніва», у якіх асвятляюцца